*Рэха працоўнага семестра-81*

# НЕ ЗАБЫВАЮЦЦА КАРЫСНЫЯ СПРАВЫ

У адзін з летніх дзён школьны двор вёскі Нісімкавічы напоўніўся вясёлым шумам, звонкімі галасамі. Не, гэта не школьнікі прыйшлі на заняткі. Тут, у сельскай школе, размясціўся студэнцкі будаўнічы атрад «Палессе» эканамічнага факультэта ГДУ.

Байцоў СБА чакалі з нецярплівасцю і кіраўнікі калгаса, і жыхары вёскі, моладзь, бо прыезд атрада заўсёды прыносіць у сельскае жыццё новы струмень.

Калектыў падабраўся баявы, згуртаваны. Усе — са стажам работы ў будатрадзе, таму нікога не палохала вялікая адказнасць, ускладзеная на іх на час трэцяга працоўнага семестра — пабудаваць зернесховішча.

У першы дзень камандзір СБА Алег Рымашэўскі правёў лінейку, растлумачыў рабятам задачы, якія стаяць перад імі. І хутка работа закіпела.

На аб'екце байцы выконвалі ў асноўным бетонныя работы. Калі ўзяцца за справу дружна, з агеньчыкам, вынік будзе абвязкова добры. Так і ў байцоў «Палесся» — хутка папаўзла ўверх крывая ходу выканання вытворчай праграмы.

А вечарам, хаця і адчувалася стомленасць, усе зноў збіраліся разам. Душа калектыву — Вася Кароткі браў у рукі акардыён, і хутка на гукі музыкі збіралася мясцовая моладзь, людзі старэйшага ўзросту. Доўга над вёскай плылі задушэўныя песні. Яны прыўзнімалі настрой перад заўтрашнім напружаным рабочым днём, надавалі новыя сілы.

Быў створаны ў атрадзе і паўстацыянарны піянерскі лагер «Спадарожнік». Баец «Палесся» Валера Будзянкоў стаў актыўным яго важатым. Ён праводзіў з дзецьмі вясёлыя захапляючыя гульні.

Спадабаліся мясцовым жыхарам канцэрты мастацкай самадзейнасці, з якімі неаднаразова выступалі ўдзельнікі атраднай агітбрыгады. На Дзень будаўніка яны паказалі цікавы канцэрт рабочым Чачэрскай ПМК-90.

Група байцоў на чале з А. Кустэнка ўзяла шэфства над Марфай Фёдараўнай Івашковай — жонкай загінуўшага партызана. Кожны дзень пасля работы яны наведвалі жанчыну, дапамагалі ёй па гаспадарцы, зрабілі рамонт у доме.

Шмат добрых спраў было зроблена байцамі СБА «Палессе», добрая памяць пакінута імі ў сэрцах людзей. У вёсцы Бабічы ёсць нямала сем'яў былых партызан, расстраляных фашыстамі. Каб увекавечыць памяць загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны мясцовых жыхароў, рабяты ўзвялі на месцы іх пахавання помнік.



За высокія вынікі ў працы, перавыкананне дагаворных работ байцы СБА «Палессе» эканамічнага факультэта былі ўзнагароджаны Ганаровай граматай ПМК-90 трэста «Гомельсельбуд», лепшым байцам атрада ўручаны граматы Чачэрскага райкома камсамола.

Трэці працоўны семестр даўно завершаны. Акуратна складзены да наступнага лета будатрадаўскія формы. А добрыя ўспаміны аб карысных справах студэнтаў не забываюцца.

**Н. НОВІКАВА,**
**студэнтка 3-га курса эканамічнага факультэта.**

**На здымку: байцы СБА «Палессе» каля пабудаванага імі помніка.**

Фота **А. Трушкова.**



**У працэсе авалодвання прафесіяй геолага вялікая роля адводзіцца практычным заняткам у разнастайных лабараторыях факультэта, аснашчаных сучаснымі прыборамі. З іх дапамогай студэнты маюць магчымасць кожны дзень адкрываць для сябе новыя таямніцы сваёй будучай прафесіі.**

**На здымку: на практычных занятках студэнт групы Г-32 геафака В. Аўсянкоў.**

Фота **У. Чысціка.**

*Размова аб прафесіі*

# КАБ СТАЦЬ ДОБРЫМ СПЕЦЫЯЛІСТАМ

Эканоміка... Які сэнс гэтага слова? Яно паходзіць з грэчаскай мовы і абазначае — мастацтва вядзення дамашняй гаспадаркі. Больш шырокае тлумачэнне — сукупнасць вытворчых адносін, якія вызначаюць грамадска-эканамічныя фармацыі, эканамічны базіс грамадства.

Студэнты эканамічнага факультэта вывучаюць прадмет «Эканоміка прамысловасці СССР». Ён дапамагае будучым спецыялістам глыбей зразумець, арыентавацца ў складаным комплексе эканомікі краіны.

Даць поўную характарыстыку прадмета, які я выкладаю ўжо 20 гадоў, у невялікім артыкуле проста немагчыма. Спынюся на некаторых яго аспектах.

Інтуітыўнае ўяўленне аб тым, што добра і што дрэнна для кожнага чалавека, можа быць падманлівым. Каб не падпарадкоўвацца інтуіцыі, а абгрунтавана вырашаць эканамічныя праблемы, студэнт павінен вывучаць эканамічныя навукі, у тым ліку і эканоміку прамысловасці. У сферы вытворчасці (а ў прамысловасці больш чым напалавіну) ствараецца багацце краіны. Вывучыўшы эканоміку прамысловасці, мы павінны весці разлікі, рабіць абгрунтаваныя вывады, навучыцца апрацоўваць вялікі аб'ём інфармацыі. Прымаць аптымальныя рашэнні, якія забяспечваюць эфектыўнае развіццё галін прамысловасці — асноўная мэта, якой мы павінны дасягнуць. А вось дабіцца найбольшых вынікаў з найменшымі затратамі пры вывучэнні курса — гэта ўжо пытанне другога плана. Таму пры вывучэнні курса трэба працаваць «на адной хвалі» і мне, як выкладчыку, і студэнтам.

У маёй практыцы не было выпадкаў паўнейшай абыякавасці да прадмета «Эканоміка прамысловасці». Хочацца, каб заўсёды даводзілася працаваць у групах, дзе будуць толькі добрыя і выдатныя веды, са студэнтамі, якія з захапленнем займаюцца навуковымі даследаваннямі (з захапленнем — значыць без прымусу). А ў выніку з такіх студэнтаў атрымаюцца добрыя эканамісты, арганізатары вытворчасці.

**Т. ТРАЦЭЎСКАЯ,**
**дацэнт кафедры галіновых эканомік.**

# РАБФАКА

та З. В. Кахно, Г. С. Хархасава, Н. В. Волкава і іншыя.

Пра пастаянны клопат нашай партыі і ўрада аб адукацыі моладзі сведчыць новая пастанова Савета Міністраў СССР, апублікаваная 15 чэрвеня 1981 года, «Аб далейшым удасканаленні падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй без адрыву ад вытворчасці». Гэты важны дакумент пашырыў магчымасці паступлення працуючай моладзі на падрыхтоўчае аддзяленне для навучання без адрыву ад вытворчасці. Таму з сёлетняга года пры нашым універсітэце, акрамя дзённага падрыхтоўчага аддзялення, адкрыта і вячэрняе. З першага кастрычніка на ім ужо займаюцца будучыя высокакваліфікаваныя работнікі народнай гаспадаркі.

Падрыхтоўчы курс разлічаны на 10 месяцаў, затым — выпускныя экзамены (па тых дысцыплінах, якія прадугледжаны на ўступных экзаменах) і залічэнне на першы курс у якасці студэнтаў.

Кантынгент слухачоў вячэрняга падрыхтоўчага аддзялення, укамплектаванага на гэты навучальны год, адпавядае ўсім патрабаванням. Людзі прыйшлі сталыя, сур'ёзныя, з багатым вытворчым і жыццёвым вопытам. Сярод такіх можна назваць В. Варапаева, Н. Сарнацкую, В. Кір'янаву, В. Лапіцкага, Л. Шлемянкову, Е. Яшкевіч, Ф. Пупкова.

У бліжэйшай перспектыве прадугледжана адкрыццё пры універсітэце падрыхтоўчага аддзялення па завочнай форме навучання. Пры гэтым трэба памятаць, што дзённыя падрыхтоўчыя аддзяленні рыхтуюць слухачоў для камплектавання толькі дзённых аддзяленняў ВНУ. Слухачы, якія закончылі падрыхтоўчае аддзяленне без адрыву ад вытворчасці (па вячэрняй ці завочнай формах навучання), маюць перавагу: яны могуць быць залічаны ва універсітэт па іх жаданню як на дзённае, так і на завочнае аддзяленне. Умовы прыёму на ўсе віды навучання аднолькавыя.

І яшчэ адна акалічнасць: падрыхтоўчае аддзяленне універсітэта рыхтуе слухачоў таксама і ў Гомельскі політэхнічны інстытут па ўсіх спецыяльнасцях, якія ёсць у ГПІ, з адрывам ад вытворчасці (дзённая форма) і без адрыву ад вытворчасці (вячэрняя форма).

Зараз вячэрняе падрыхтоўчае аддзяленне пры ГДУ ужо ўкамплектавана. Ідуць заняткі ў добра абсталяваных, прасторных аўдыторыях галоўнага корпуса.

Адначасова вядзецца карпатлівая работа па адбору моладзі на дзённае падрыхтоўчае аддзяленне, заняткі на якім разлічаны на 8 месяцаў навучання. Заняткі, як заўсёды, пачнуцца 1 снежня.

Увесь клопат аб слухачах універсітэт бярэ на сябе: забяспечвае стыпендыяй, інтэрнатам, падручнікамі. Слухачы, як і студэнты, карыстаюцца бібліятэкамі, чытальнымі заламі, вучэбнымі кабінетамі і лабараторыямі, спартыўнымі заламі, санаторыем-прафілакторыем. Яны актыўна ўключаюцца ва ўсе віды грамадскай дзейнасці і атрымліваюць магчымасць авалодаць усімі сучаснымі ведамі. Адначасова слухачам падрыхтоўчага аддзялення прадастаўляецца магчымасць павысіць узровень сваёй культуры, пашырыць навукова-тэхнічны кругагляд, атрымаць трывалы фундамент ведаў. У нас створана дакладная сістэма такой падрыхтоўкі, ажыццяўляецца кантроль за ёю.

Слухачы атрымліваюць кваліфікаваную дапамогу па прафілюючых дысцыплінах. У сваёй рабоце выкладчыцкі састаў падрыхтоўчага аддзялення спалучае вузаўскія і школьныя метады навучання. Прымяняюцца такія формы заняткаў, як лекцыі, практычныя і лабараторныя заняткі, калёквіўмы, семінары. Выкарыстоўваюцца наглядныя дапаможнікі, тэхнічныя сродкі навучання, ілюстрацыйны матэрыял. Шырока практыкуюцца групавыя і індывідуальныя кансультацыі, дадатковыя заняткі. Усе гэтыя формы і метады работы павышаюць эфектыўнасць вучэбна-выхаваўчага працэсу, даюць магчымасць рыхтаваць добрае папаўненне ў ГДУ і ГПІ.

**Л. ВАЎКАГОН,**
**загадчыца падрыхтоўчага аддзялення ГДУ.**
**А. ЧЫЖЫК,**
**выкладчыца падрыхтоўчага аддзялення.**

*Да ўвагі чытачоў*

# ПРАПАНУЕ КНІГАРНЯ

Кнігарня № 19 па вул. Савецкай, 106 прапануе чытачам кнігі, якія нядаўна паступілі ў продаж. Гэта выбраныя творы класікаў марксізму-ленінізму, матэрыялы XXVI з'езда, грамадска-палітычная літаратура:

**К. Маркс, Ф. Энгельс.** Выбраныя творы: У 3-х т.— М.: Палітвыдат, 1980.

**У. І. Ленін.** Выбраныя творы: У 3-х т. — М.: Палітвыдат, 1980.

**У. І. Ленін.** КПСС аб савецкай шматнацыянальнай дзяржаве. — М.: Палітвыдат, 1980.

**Л. І. Брэжнеў.** Выбраныя творы: У 3-х т. — М.: Палітвыдат, 1981.

**Л. І. Брэжнеў.** Ленінскім курсам. Прамовы, прывітанні, артыкулы. — М.: Палітвыдат, 1981, т. 8.

**Несцяровіч Я. Ю.** За саюз непарушны рэспублік свабодных: аб'яднаны рух працоўных Беларусі. — Мн.: Выдавецтва БДУ, 1981.

Нацыянальная палітыка КПСС: Нарыс гісторыяграфіі (Бурмістрава Т. Ю., Зайцава Е. А. і інш.) —М.: Палітвыдат, 1981.

Марксізм-ленінізм і сучасная эпоха: Матэрыялы навуковай канферэнцыі, прысвечанай 110-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна. Масква, 15—17 красавіка, 1980. — М.: Палітвыдат, 1981.

Матэрыялы XXVI з'езда КПСС. — М.: Палітвыдат, 1981.

Па Савецкаму Саюзу. Замежныя аўтары аб Савецкім Саюзе. —М.: Прагрэс, 1981.

Пад сцягам Кастрычніка: Зборнік дакументаў і матэрыялаў у 2-х тамах. 25 кастрычніка (7 лістапада) 1917 г. — 7 лістапада 1923 г. — М.: Палітвыдат, Сафія: Выдавецтва БКП, 1980.

Партыйнае будаўніцтва: Вучэбны дапаможнік. (Пятровічаў Н. А., Кузьмін Н. Ф. і інш.)— М.: Палітвыдат, 1981.

**Сікорскі В. М.** Партыя класа, партыя народа: Аб адзінстве класавага і агульнанароднага ў характары і дзейнасці КПСС на сучасным этапе. — Мн.: Выдавецтва БДУ, 1980.

Салдаты слова: Расказваюць ветэраны савецкай журналістыкі. — М.: Палітвыдат, 1980.

**ВЫЙШЛІ З ДРУКУ:**

**Міхалёва Н. А.** Сацыялістычная канстытуцыя: Праблемы тэорыі. —М.: Юрыд. літ., 1981.

**Галатвін Ж. Г.** Адзіная сям'я савецкіх народаў: Сацыяльная роднасць і згуртаванасць. — М.: Мысль, 1981. (XXVI з'езд КПСС: праблемы тэорыі і практыкі).

Праблемы навуковага камунізму ў матэрыялах XXVI з'езда КПСС. — Л.: Ленвыдат, 1981.

Развіты сацыялізм: Праблемы тэорыі і практыкі. — М.: Палітвыдат, 1981.

**Руткевіч М. Н.** XXVI з'езд КПСС і пытанні сацыяльнага развіцця савецкага грамадства. — М.: Знание, 1981.

**Пугачоў Б. М.** Збліжэнне краін сацыялізму: Пытанні тэорыі і практыкі. — М.: Наука, 1981.

Ашчаднасць — рыса камуністычная. (Рашэнні XXVI з'езда КПСС — у жыццё). Даведнік прапагандыста-міжнародніка. — М.: Палітвыдат, 1981.

